# Васіль Быкаў “Незагойная рана”: вобраз галоўнай гераіні твора

**А. А. Козел,**

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

вышэйшай кваліфікацыйнай катэгоры

СШ № 7 г. Ваўкавыска

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні:

**будуць ведаць**: ідэйна-мастацкі змест і сюжэт апавядання «Незагойная рана» В. Быкава, засяродзіўшы ўвагу на драматызме становішча старой Тэклі;

**авалодаюць паняццямі**: мастацкі вобраз;

**удасканаляць навыкі:** работы з апорным кластарам, табліцай, з мастацкім творам (эпічным).

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў**: стварыць умовы для абуджэння пачуцця патрыятызму на аснове знаёмства з ваенным шляхам землякоў; для развіцця інтэлектуальных здольнасцей, аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў.

**Абсталяванне:** рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў (І. Давідовіч”Маці”, І.Рэй “Дзякуй, мама”, Ю. Пучынскі “Памяць”, фотаздымак манумента маці – патрыётцы А. Ф. Купрыянавай у г. Жодзіна)

**Месца правядзення:** музей школы

**Эпіграф:** Ідуць гады,

І кожны дзень чакае маці сына. (В. Зуёнак)

**\Ход урока**

I. **Арыенціровачна-матывацыйны этап**
   1. **Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.**
   2. **Мэтавызначэнне.**

      **Настаўнік.** Сённяшні ўрок я хачу пачаць з верша А. Куляшова “Над брацкай магілай”, які дапаможа нам вызначыць тэму ўрока.
      - Якая тэма і каму прысвечаны верш? (*тэма вайны, памяці пра вайну, пра салдат, якія пайшлі на вайну і не вярнуліся з яе*)
      - Якія пачуцці ў вас узнікаюць?
      - Ці падобныя яны на тыя, што з’явіліся пасля знаёмства з апавяданнем “Незагойная рана” ?
      - У чым падабенства гэтых твораў?

        Вучні самастойна фармулююць мэты ўрока,запісваюць у сшыткі, працягнуўшы выразы:

        даведаюся… вызначу… выкарыстаю…

**II. Пазнавальны этап**

**Настаўнік.** У 1941 годзе пачалася вайна. Мужчыны прызыўнога ўзросту пайшлі на фронт, і пацягнуліся страшныя чатыры гады пазбаўленняў, чакання і гора.

Рабяты, ці ведаеце вы нашых землякоў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны?

Іх імёны? Іх лёсы? Дзе спачывае прах тых, хто загінуў далёка ад роднага дому?

З якіх крыніц мы можам атрымаць інфармацыю? ( *Ваенныя архівы, кніга "Памяць", розныя сайты, ваенкаматы, успаміны сваякоў*)

Правільна, з некаторымі з гэтых крыніц мы сёння з вамі можам пазнаёміцца.

У самых маштабных бітвах Вялікай Айчыннай вайны прымалі ўдзел нашы землякі. Масква,Сталінград, Курск – гэта няпоўны пералік геаграфічных назваў, дзе яны змагаліся, дзе засталіся іх магілы.

Алё есць у нашым спісе прозвішчы землякоў, пра лёс якіх інфармацыі няма, няма звестак пра месца гібелі і пахавання. Магчыма, яны так і засталіся ляжаць там, дзе іх напаткала смерць: у бліндажах, у засыпаных акопах або варонках. У палях, лясах і балотах да гэтага часу ляжаць невядовыя астанкі воінаў, якія загінулі на той вайне.(*Вучні знаёмяцца з кнігай "Памяць")*

-Галоўная гераіня апавядання "Незагойная рана" – старая жанчына, якая чакае з вайны сына. І сапраўды, колькі іх, матуль, якія чакалі сваіх сыноў. У вобразе старой Тэклі аўтар раскрывае боль і перажыванні ўсіх жанын-маці, якія страцілі дзяцей на вайне.

**1. Вучням прапануецца пазнаць героя па апісаннях**

1)"...Яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах».

2) "…Набліжаецца абочынай дарогі, потым, унізе, пад пагоркам, злазіць з машыны, выводзіць яе з калдобін і зноў сядае, локцем адкінуўшы на спіну цяжкую сумку».

3) «Шпаркай хадой рухавага чалавека ён хутка аддаляўся, па самыя плечы затулены ўмалотнай высокай збажыной, не азірнуўся, аж пакуль не адышоўся далёка».

4) «Усё балбатала пра тое ды гэта, а потым, быццам адчуўшы, як далёка яе размова ад сэрца жанчыны, змоўкла і, ужо ўзяўшыся за клямку, уздыхнула....». 5)"... Выйшла замуж і жыла ў далёкай вёсцы».

6) «…Пры кожнай сустрэчы цярпліва запрашаў да сябе».

**2. Асэнсаванне**

- Якое ўражанне ствараюць агучаныя апісанні герояў?
- Ці дапамагае знешняя партрэтная характарыстыка героя глыбей зразумець сутнасць іх характараў, паводзін, адносін да людзей?

**3.Паглыбленне ў тэорыю літаратуры**

Работа з вучэбным дапаможнікам. Знайсці ў слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў,што такое мастацкі вобраз. Скласці апорны канспект.

**Фізкультхвілінка**

**4. Работа з кластарам**

**Заданне.** Ахарактарызаваць гераіню ў адпаведнасці з крытэрыямі.




(Агучваюцца вынікі работы.)

**5. Творчая работа. Складанне верша-сінквейна**

- Як вы лічыце, на што пісьменнік ускладвае адказнасць за пакуты маці?(*На вайну ўвогуле*)
  Паспрабуем наша ўспрыманне вайны, адносіны да яе абагульніць у вельмі кароткім, лаканічным запісе. Мы напішам верш-сінквейн на тэму “Вайна” (*вучні складаюць сінквейны,зачытваюць свае запісы)*

Вайна.
Страшная, жорсткая.
Забівае, калечыць, знішчае.
Губіць жыцці нявінных людзей.
Незагойная рана.

**6. Работа над тэкстам**

- Паспрабуйце вызначыць тэму і ідэю твора, зрабіце кароткі запіс у табліцы (*Тэма - пакутлівае чаканне сына з вайны; ідэя – непераможнасць мацярынскага сэрца, душы*)

– Звярніце ўвагу на эпіграф да нашага ўрока.(*Вучань зачытвае эпіграф*)

- Як вы разумееце гэтыя словы? (*Вучні даюць тлумачэнні*)

**7. Групавая работа. "Сустрэча" з героямі апавядання**

*Заданне для першай групы.*
Уявіце, што вы сустрэліся з маці. Звярніцеся да яе, супакойце, аблегчыце пакуты чакання.
*Заданне для другой групы.*
Уявіце, што вы сустрэліся з сынам, які вярнуўся з фронту. Раскажыце пра тое, як пакутліва яго чакала маці.

**8. Групавая работа. Супастаўленне апавядання з творамі жывапісу.**

Уважліва разгледзьце рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў( *змешчаны на дошцы).*
- Якую з іх вы выбралі б у якасці ілюстрацыі да апавядання? Абгрунтуйце свой выбар.

**III. Кантрольна- карэкцыйны этап**

Вучням прапануецца паразважаць над пытаннем:
- Чаму, на вашу думку, аўтар пакідае гераіню ля помніка-абеліска(*Усе помнікі – гэта ўшанаванне памяці і напамін. Пра вайну трэба памятаць, каб яна ніколі не паўтарылася, шанаваць памяць пра тых, хто цаной уласнага жыцця здабыў для нас мір).*

**IV. Рэфлексія**

- Працягніце выказванні( *на выбар*):
  " Я задаволены тым, што…"
  " Я хацеў бы параіць усім маці…"
  " Я абавязкова наведаю…"

**V. Дамашняе заданне**

Прадоўжыце апавяданне, развіваючы сюжэт і прытрымліваючыся агульнага настрою твора( каб пачуцці гераіні, падзеі, якія адбудуцца ў вашым апавяданні, былі блізкія да агульнага настрою апавядання).